ДУК «БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА ХОЦІМСКАГА РАЁНА»
БЯРОЗКАЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

# КАЗКІ НА РОДНАЙ МОВЕ

ВІРТУАЛЬНАЯ ВЫСТАВА



**Паважаныя маленькія чытачы!**

**Запрашаем вас звярнуць увагу на кніжкі, прадстаўленыя на выставе. Гэтыя творы сучасных беларускіх пісьменнікаў не пакінуць вас раўнадушнымі да навакольнага свету, навучаць беражліва адносіцца да прыроды, з павагай ставіцца да бацькоў і любіць Радзіму. Кнігі вельмі прыдатныя і для сямейнага чытання.**






Аўласенка, Г. Казкі дзядулі Дняпра : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Генадзь Аўласенка ; мастак Святлана Стахоўская. — Мінск : Звязда, 2012. — 136 с.

*У кнізе юныя чытачы знойдуць шмат цікавай інфармацыі. І па гісторыі, і па геаграфіі, і па біялогіі. Але ўсё ж асноўнае ў ёй – казкі! Гэтыя казкі расказвае дзецям сам дзядуля Дняпро, а таксама галоўныя яго прытокі: Сож, Бярэзіна, Прыпяць. А некалькі казак для дзяцей прынёс у сваім маленькім кошыку нават…Вожык. Ён іх у лесе назбіраўю.*




**Бучынская, Н. Атракцыёны для вадзянікоў : былі і небыліцы пра жыццё надводнае і падводнае / Наталля Бучынская ; ілюстрацыі Андрэя Пазняка. — Минск : Мастацкая літаратура, 2015. — 80 с. : іл.**

***Пад вадой азёраў і рэк хаваецца шмат таямніц. Тут жывуць незвычайныя істоты, адбываюцца чароўныя падзеі, часам нават вадзянікі катаюцца на атракцыёнах. Фантазія пісьменніцы Наталлі Бучынскай дазваляе нам зазірнуць у гэты чароўны свет.***




**Давідовіч, С. Ф. Дзедава жалейка : казкі і прыгоды / Сяргей Давідовіч ; мастак С. Волкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. — 95 с.**

***У кнігу ўвайшлі казкі, якія вучаць дзяцей спагадлівасці, сумленнасці, шчырасці. Аўтар распавядае пра прыгоды Бычэчка Воліка, Павука і Мухі-весялухі, Зайкі і Зайчыка, пра сустрэчу хлопчыка Стасіка з іншапланецянамі і пра тое, як неслухі-праменьчыкі гуляліся з запалкамі, а таксама дае адказ на пытанне: як пісаць казкі?***




**Дамаронак, Т. І. Казкі сінявокай зямлі : для малодшага школьнага ўзросту / Т. Дамаронак ; мастак Э. Папова. — Мінск : Беларусь, 2016. — 160 с.**

***Гэта кніга ў казачнай форме пазнаёміць юнага чытача з выдатнымі куткамі беларускай зямлі.***

***Адправіўшыся ў віртуальнае вандраванне па родным краі разам з дапытлівымі героямі казак, чытач даведаецца пра багацце беларускіх лясоў, рэк і азёр. А яшчэ сустрэне новых добрых сяброў.***




**Казкі сівой даўніны : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Юрый Задворны. — Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2014. — 32 с. : іл. — (Вясёлы калейдаскоп).**

***Таямнічае заўсёды існавала і існуе побач з намі. У загадкавых істот верылі нашы продкі, не сумняваліся і у тым, што некаторыя людзі валодаюць незвычайнымі здольнасцямі. Пра гэта — казка Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Калі ў вас жыве дух авантурызму, то гэтыя творы абавязкова прыйдуцца вам даспадобы.***




**Пазнякоў, М. Серабрыстыя чайкі : казкі, апавяданні : для сярэдняга школьнага ўзросту / Міхась Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2013. — 110 с. : іл.**

***Новую кнігу М. Пазнякова склалі арыгінальныя апавяданні і казкі на самыя розныя тэмы. Займальныя і пазнавальныя, яны пашыраюць кругагляд дзяцей, садзейнічаюць выхаванню дабрыні і суперажывання, міласэрнасці і высакародства, любові да роднай прыроды. Аўтар па-мастацку, вобразна вырашае важныя пытанні сумленнасці, праўдзівасці, дабрыні.***




**Сіняўскі, П. І. Зачараваная гаспадарка : казкі гаспадара Пятра з-пад Полацка / Пятро Сіняўскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 85 с. : іл.**

***Казкі, сабраныя ў гэтай кнізе, уражваюць трапнай самабытнай мовай, а казачныя падзеі адмыслова знітаваныя з сучаснасцю. Прыгоды, дзівосы, вандроўкі ў пошуках шчасця і сэнса жыцця – казкі Пятра Сіняўскага будуць цікавымі і дзецям, і дарослым.***




Скаржынская-Савіцкая, Г. І. Надзейка-чарадзейка : казкі / Ганна Скаржынская-Савіцкая. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2014. — 46 с. : іл.

*У кнігу ўвайшлі дзіцячыя казкі пазнавальнага і павучальнага характару. Хто важнейшы – Хмара або Ручаёк? Чаму Расінка сяброе з Сонечным Зайчыкам? Ці могуць пасябраваць Хітраня і Падскакайчык? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні вы будзеце ведаць, калі прачытаеце кнігу.*




**Сліва, М. Як кнігі дзяўчынку выхавалі : апавяданні, казкі / Міхась Сліва. — Мінск : Народная асвета, 2014. — 46 с.**

***Аўтар раскрывае цікавы і таямнічы дзіцячы свет. Тут гавораць кнігі, якія крыўдзяцца на таго, хто нядбайна да іх адносіцца; веласіпед сам рухаецца куды патрэбна; кот сябруе з мышкай. Усе творы нясуць вясёлы настрой, радасць жыцця, выхоўваюць міласэрнасць, веру у добрае і светлае.***




Цінякова, Л. Дзівосы летняга лугу : казкі / Людміла Цінякова. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — 38 с. : іл.

*Якімі клопатамі жывуць матылькі, жукі, мурашы і пчолы, як яны харчуюцца, як зімуюць – пра ўсе гэта вам раскажа гэта кніга.*

*Казкі Людмілы Ціняковай адрасаваны самым маленькім дзеткам, якія робяць першыя крокі ў пазнанні прыроды*




**Як Мурлыку ашукалі : казкі : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / укладальнік Вольга Аляксеева ; мастак Марыя Каратаева. — Мінск : Звязда, 2014. — 152 с. — (Казачны куфэрак).**

***Маленькі чытач знойдзе тут для сябе казкі на любы густ – і вершаваныя, і празаічныя, і пра хлопчыкаў і дзяўчынак, і пра жывёльны свет, і нават пра фантастычных істот.***

Якімовіч, А. М. Казкі-падказкі : для малодшага школьнага ўзросту / А. М. Якімовіч. — Мінск : Народная асвета, 2012. — 103 с. : іл.




*У кнізе сабраны незвычайныя мастацка-навуковыя казкі. Пабудаваныя ў займальнай форме, яны падказваюць чытачам, якія правілы трэба ведаць, каб правільна карыстацца мовай. Гэтыя казкі нагадваюць загадкі.*




**Якімовіч, А. М. Я, Сямен і барабашка : аповесць-казка / А. М. Якімовіч. — Мінск : Народная Асвета, 2011. — 126 с.**

***Сюжэт кнігі пабудаваны на тым, як два сябры-шасцікласнікі Язэп і Сямён заўважаюць, што ў Язэпавай хаце пасяліўся таемны барабашка. Затым хлопцы разам з барабашкам трапляюць у незвычайную краіну, Ў якой побач з людзьмі жывуць язычніцкія багі. У той краіне і пачынаюцца сапраўдныя прыгоды хлопцаў і іх сяброўкі Пярвушкі.***

**Паважаныя чытачы!**

**Калі вас заціікавілі кнігІ з выставы, завітайце ў Бярозкаўскую сельскую бібліятэку.**



**Мы працуем**
**з 9.00 да 17.00**
**Перапынак з 13.00 да 14.00**
**Нядзеля: з 10.00 да 16.00**
**Перапынак з 13.00 да 14.00**
**Выхадны: панядзелак.**